CENTRALNA KOMISJA EGZAMINACYJNA

Arkusz zawiera informacje prawnie chronione do momentu rozpoczęcia egzaminu.

**MOB 2020**

**WYPEŁNIA ZDAJĄCY**

| KOD | PESEL |
|---|---|
| | |

*miejsce na naklejkę*

# EGZAMIN MATURALNY Z JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO

## POZIOM ROZSZERZONY

DATA: **21 maja 2020 r.**
GODZINA ROZPOCZĘCIA: **14:00**
CZAS PRACY: **180 minut**
LICZBA PUNKTÓW DO UZYSKANIA: **40**

| WYPEŁNIA ZESPÓŁ NADZORUJĄCY |
|---|
| Uprawnienia ucznia do: |
| ☐ dostosowania kryteriów oceniania. |

NOWA FORMUŁA

**Instrukcja dla zdającego**

1. Sprawdź, czy arkusz egzaminacyjny zawiera 9 stron. Ewentualny brak zgłoś przewodniczącemu zespołu nadzorującego egzamin.
2. Pisz czytelnie. Używaj długopisu/pióra tylko z czarnym tuszem/atramentem.
3. Nie używaj korektora, a błędne zapisy wyraźnie przekreśl.
4. Pamiętaj, że zapisy w brudnopisie nie będą oceniane.
5. Możesz korzystać ze słowników językowych.
6. Na tej stronie oraz na karcie odpowiedzi wpisz swój numer PESEL i przyklej naklejkę z kodem.
7. Nie wpisuj żadnych znaków w części przeznaczonej dla egzaminatora.

MOB-R1_1P-202

Układ graficzny
© CKE 2015

**MOB 2020**

**Wybierz jeden temat i napisz wypracowanie.**

**Тэма 1. На падставе фрагмента артыкула Юліі Шпаковай *Казка – у жыцці падказка* прадстаў тэму і паразважай над ёй. Карыстайся тэзісам і думкамі аўтаркі і звярніся да іншых тэкстаў культуры. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Юлія Шпакова
***Казка – у жыцці падказка***

У Еўропе і ЗША кнігі для дзяцей і падлеткаў па папулярнасці знаходзяцца на другім месцы сярод іншых жанраў. Традыцыйна значную частку дзіцячай літаратуры складаюць казкі. Жыхарам нашай краіны асабліва пашчасціла: беларускія казкі вызначаюцца сюжэтнай разнастайнасцю. Па падліках айчынных даследчыкаў, каля 50 сюжэтных тыпаў беларускіх казак не маюць аналогій у міжнародных паказальніках казкавых сюжэтаў. […]

Па словах літаратуразнаўцы Івана Саверчанкі, „казкі – не толькі шэдэўр слоўнага мастацтва, але і духоўная сутнасць народа. Яны развіваюць фантазію, творчае мысленне, адлюстроўваюць светапогляд і лад жыцця нашых продкаў, злучаюць пакаленні”.

У дзяцінстве творы гэтага жанру – магчымасць не толькі трапіць у чароўны захапляльны свет, але і навучыцца ацэньваць свае ўчынкі і асэнсоўваць рэчаіснасць. Дарослыя нярэдка пераказваюць ці перачытваюць вядомыя з дзяцінства казкі сваім дзецям, а потым – унукам і нярэдка здзіўляюцца незаўважаным раней падтэкстам і ідэям – што датычыцца як народных, так і літаратурных казак.

Яшчэ большую ролю адыгрывалі казкі ў мінулым – дзвесце і нават сто гадоў таму. Казка не толькі дапамагала выхоўваць і забаўляць дзяцей. Яна аб’ядноўвала сваякоў і аднавяскоўцаў, бо дзеці часта хадзілі да добрых апавядальнікаў слухаць казкі. […]

У вёсцы ці ў леснічоўцы было адносна няшмат варыянтаў баўлення вольнага часу – і важна, што сяляне ды іншыя працаўнікі часта рабілі выбар на карысць тэкстаў традыцыйных, пачутых калісь ад бацькоў і дзядоў...

Удзельнікі этналагічных экспедыцый дагэтуль з захапленнем запісваюць казкі ад носьбітаў традыцыі. У беларускіх вёсках жывуць таленавітыя апавядальнікі, якія распавядаюць казкі, пачутыя ад суседзяў і старэйшых сваякоў, – пераказваюць традыцыйныя сюжэты, узнаўляюць інтанацыю, стылістычныя прыёмы... […]

Прагрэс не спрыяе захаванню фальклорных традыцый. З аднаго боку, дзякуючы навукова-тэхнічным дасягненням народная казка застаецца з намі, у сучаснай культуры, надзейна захаваная на розных носьбітах. Выдаюцца кнігі народных казак, казкі можна лёгка знайсці ў інтэрнэце...

З іншага боку, казкі яшчэ доўга будуць расказвацца. Нярэдка здараецца, што пад рукой няма кнігі ці планшэта, а дзіця з задавальненнем паслухае займальную гісторыю. І тут свядомым бацькам варта пацікавіцца, якія казкі расказвалі на іх малой радзіме, альбо аднавіць у памяці беларускія казачныя сюжэты, якія будуць арганічна ўспрымацца сучаснымі дзецьмі.

Паводле: Ю. Шпакова, *Казка – у жыцці падказка*, www.zviazda.by

**Тэма 2. Зрабі пераўнаўчы аналіз і інтэрпрэтацыю вершаў. Твая праца павінна налічваць не менш за 300 слоў.**

Максім Багдановіч
***Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя…***

Калі зваліў дужы Геракл у пыл Антэя,
Як вецер валіць поўны колас да раллі, –
Ўдыхнула моц у грудзі сына мацер Гея,
І вось, цвярды, як дуб, яшчэ, чым перш, сільнее,
Ён, напружыўшыся, падняўся ўраз з зямлі.

Паломаны жыццём, чакаючы магілы,
Радзімая зямля, прынікнуў я к табе,
І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы,
Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы,
І месца ў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе.

М. Багдановіч, *Інтымны дзённік. Выбраныя творы*, Мінск 2006, с. 80.

Віктар Швед
***Беласточчына***

Беласточчына, мая замелька родная,
Жывеш заўсёды ты ў глыбі маіх грудзей.
Нідзе мясціны не сустрэў ніводнае,
Што мне была б хоць крышку даражэй.

Вось родны краявід, палоскі вузкія,
Якія дробніў люд вясковы з году ў год;
Сярод палёў – пасёлкі беларускія,
Дзе ад вякоў жыве мой дарагі народ.

Гляджу, прысела хатка там вясковая,
Дзе крокі першыя ў жыцці сваім рабіў,
Дзе ад бацькоў вучыўся роднай мове я,
Якую ў шуме дзён ікмлівых не забыў.

На Беласточчыне пражыў я маладосць,
Ды што пражыў – я нарадзіўся тут.
Таму была найдаражэйшаю і ёсць
Мне Беласточчына, мой родны, мілы кут.

В. Швед, *Беласточчына*, [у:] В. Сянкевіч, *Родная літаратура. Падручнік па беларускай літаратурнай і культурнай адукацыі для вучняў 1 класа агульнаадукацыйнага ліцэя*, Białystok 2013, с. 65.

# WYPRACOWANIE

**na temat nr....................**

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

........................................................................................................................................................

....................................................................................................................................................

....................................................................................................................................................

....................................................................................................................................................

....................................................................................................................................................

....................................................................................................................................................

**<u>Tabelę wypełnia egzaminator!</u>**

| | | Liczba punktów | Suma | Uzasadnienie przyznania 0 punktów |
|---|---|---|---|---|
| **wypowiedź argumentacyjna** | **A.** | **0 – 3 – 6 – 9** | | |
| | **B.** | **0 – 3 – 6 – 9** | | |
| **interpretacja porównawcza** | **A.** | **0 – 2 – 4 – 6** | | |
| | **B.** | **0 – 4 – 8 – 12** | | |
| | **C.** | **0 – 2** | | |
| | **D.** | **0 – 3 – 6** | | |
| | **E.** | **0 – 1 – 2** | | |
| | **F.** | **0 – 2 – 4** | | |
| | **G.** | **0 – 2 – 4** | | |
| | **H.** | **0 – 2 – 4** | | |

# BRUDNOPIS *(nie podlega ocenie)*